# 2024 г. – 85 гадоў з часу стварэння Кобрынскага раённага аддзела ўнутраных спраў (1939)



Міліцыя Брэстчыны бярэ пачатак з 1939 года, з часу аб'яднання заходніх абласцей Беларусі з БССР. Згодна з загадам НКУС СССР ад 2 лістапада 1939 года «Аб арганізацыі органаў НКУС Заходняй Беларусі» быў створаны НКУС па Пінскай вобласці, якому быў падпарадкаваны Кобрынскі аддзел НКУС.

На Кобрыншчыне праводзілася актыўная барацьба па арганізацыі рабочай гвардыі для аховы парадку ў г. Кобрыне і павеце (раён створаны 15 студзеня 1940 года). Пастановай Часовага ўпраўлення г. Кобрына і Кобрынскага павета ад 7 верасня 1939 года «Аб арганізацыі рабочай гвардыі для аховы грамадскага парадку ў г. Кобрыне і павеце» быў створаны Кобрынскі павятовы аддзел міліцыі. Яго першым начальнікам прызначаны малодшы лейтэнант міліцыі Міхаіл Сямёнавіч Ісмакаў (1939-1941). Гвардыя аб'яднала членаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, былых зняволеных польскіх турмаў, патрыётаў сваёй Радзімы.

Кобрынская міліцыя прайшла слаўны і гераічны шлях. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны работнікі прыклалі нямала намаганняў для абясшкоджвання варожых агентаў і дыверсантаў, а пасля вызвалення раёна супрацоўнікі аддзела вялі бязлітасную вайну з узброенымі бандамі дызертыраў, здраднікаў, крымінальнікаў і нацыяналістаў. Многія загінулі, абараняючы правапарадак. Актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам, злачыннасцю прымалі першыя ўчастковыя інспектары А. І. Ратайка, К. П. Тур, М. І. Барздун. Гераічны шлях у гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў участковы М. М. Шаўчук, які за мужнасць і гераізм быў узнагароджаны 12 ордэнамі і медалямі.

За гады існавання неаднаразова мяняліся назвы і ведамасная падпарадкаванасць органаў унутраных спраў, аднак, нязменным застаецца галоўнае - абарона грамадзян, грамадства і дзяржавы ад злачынных замахаў. На працягу многіх гадоў, вырашаючы задачы па ахове грамадскага парадку, вядучы барацьбу са злачыннасцю, супрацоўнікі дамагаліся нядрэнных вынікаў. Іх нялёгкая праца заўсёды па заслугах ацэньвалася.

Высокіх паказчыкаў дабіліся кобрынскія міліцыянеры ў 1980-я гады. У 1986 годзе заваявалі пераходзячы прыз МУС імя батальёна міліцыі капітана К. І. Уладзімірава. У 1987 годзе Кобрынскі АУС занесены ў Кнігу Пашаны МУС БССР. Калектыў тройчы ўзнагароджваўся пераходным Чырвоным Сцягам УУС Брэсцкага аблвыканкама, як пераможца спаборніцтва сярод органаў унутраных спраў Брэстчыны (1988, 1989, 1990). Пасля апошняга ўзнагароджання Чырвоны Сцяг пакінуты ў калектыве навечна і беражліва захоўваецца.

У 1990-я гады сярод лепшых супрацоўнікаў Кобрынскага ГРАУС: оперупаўнаважаныя аддзела крымінальнага вышуку Ю. П. Дзядзюк, П. М. Магуйла, намеснік начальніка АБЭЗ Г. П. Ператолчын, оперупаўнаважаныя АБЭЗ А. У. Макарук, В. В. Вішнеўскі, участковыя інспектары С. В. Цімашчук, А. А. Кананчук, М. Ф. Ігнацюк і інш.

Са жніўня 1962 года раённы аддзел міліцыі размяшчаўся ў будынку былога Спаскага манастыра, помніку архітэктуры XVII стагоддзя. Асобныя службы былі раскіданыя па горадзе і сувязі паміж імі не было. У лістападзе 2009 года РАУС пераехаў у новы сучасны будынак (вул. Савецкая, 135/6), у якім знаходзіцца 98 службовых памяшканняў, абсталяваных лакальнай сеткай. У цокальнай частцы - стралковы цір і трэнажорная зала. У будынку і па перыметры – камеры відэаназірання, усталяваны прапускны турнікет.

Сёння супрацоўнікі з гонарам працягваюць традыцыі старэйшых пакаленняў. Па выніках аператыўна-службовай дзейнасці Кобрынскі РАУС неаднаразова прызнаваўся лепшым у вобласці і рэспубліцы. З моманту зацвярджэння ў 2011 годзе пераходнага прыза імя В. П. Асташэнкі (генерал-маёра міліцыі, які ў 1961–1975 гг. узначальваў УУС Брэсцкага аблвыканкама) чатыры разы станавіўся яго ўладальнікам. Па выніках працы за 2020 год АУС Кобрынскага райвыканкама прызнаны найлепшым сярод аналагічных падраздзяленняў Брэсцкай вобласці. Пры гэтым лепшымі ў вобласці службамі, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў па сваіх кірунках дзейнасці, сталі аддзяленне наркакантролю і супрацьдзеянні гандлю людзьмі, аддзяленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. Характэрна, што 19 супрацоўнікаў, якія праходзілі службу ў аддзеле, у далейшым станавіліся кіраўнікамі гарадскіх і раённых АУС, а таксама структурных падраздзяленняў упраўленняў, а 27 міліцэйскіх дынастый з

годнасцю прадстаўлялі сем'і супрацоўнікаў аддзела на рэспубліканскіх аглядах-конкурсах.

У Кобрынскай міліцыі закладзены добрыя традыцыі. 28 лютага 2013 года ля будынка РАУС адкрыты памятны знак, які ўвекавечыў подзвіг загінуўшых пры выкананні службовых абавязкаў супрацоўнікаў Кобрынскага РАУС. Дзесяць імёнаў высечаны на гранітнай пліце, якая прымацавана да белай мармуровай груды. Важнай старонкай гісторыі райаддзела стала адкрыццё ў 2019 годзе пакоя гісторыі, у якім сабраны дзясяткі цікавых экспанатаў: дакументы, фатаграфіі, узнагароды, узоры міліцэйскай формы розных эпох. Прадстаўлена інфармацыя аб калегах, якія ахоўвалі грамадскі парадак у перыяд станаўлення РАУС. Асобныя стэнды прысвечаны ранейшым кіраўнікам РАУС, міліцыянерам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пры выкананні службовых абавязкаў.

На Брэстчыне вядомы ансамбль народнай музыкі і песні «Кобрынскія музыкі» (кіраўнік Віктар Іванавіч Селядцоў), які быў створаны ў 1997 годзе. Калектыў (сем супрацоўнікаў міліцыі) неаднаразова заваёўваў званне лаўрэата рэспубліканскіх аглядаў мастацкай творчасці ўстаноў і падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. З 2002 года носіць высокае званне «народны калектыў».

У розныя гады ўзначальвалі аддзел маёр дзяржбяспекі Міхаіл Новікаў (1944-1945), маёр міліцыі Ісаак Ягуткін (1945-1950), падпалкоўнік міліцыі Сямён Равенка (1953-1959), маёр міліцыі Мітрафан Сітнік (1959-1963), палкоўнік міліцыі Васілій Галаўко (1963-1977), падпалкоўнік міліцыі Пётр Гарбуноў (1977-1981), палкоўнік міліцыі Мікалай Карніевіч (1981-1995), падпалкоўнік міліцыі Яўгеній Грамыка (1995-1998), палкоўнік міліцыі Сяргей С’едзін (1998-2003), палкоўнік міліцыі Генадзій Ператолчын (2003-2004), палкоўнік міліцыі Аляксандр Шарында (2004-2006), палкоўнік міліцыі Эдуард Ярашук (2007-2010), палкоўнік міліцыі Максім Субота (2010-2015), палкоўнік міліцыі Уладзімір Сцепанюк (2015-2020), падпалкоўнік міліцыі Андрэй Дулевич (2020-2024). У 2024 годзе на пасаду начальніка аддзела ўнутраных спраў Кобрынскага райвыканкама назначаны падпалкоўнік міліцыі Сяргей Міхайлавіч Пятраеў.

У рэаліях сённяшняга дня Кобрынскі АУС - гэта сіла, якая можа супрацьстаяць крымінальнаму гвалту. І гэтую работу

вядуць адданыя справе супрацоўнікі, здольныя прафесійна забяспечыць надзейную ахову жыцця і здароўя, маёмасную бяспеку грамадзян. Зніжэнне агульнага ўзроўню злачыннасці ў раёне, вялікі працэнт раскрывальнасці злачынстваў - доказы таго, што ў кобрынскай міліцыі нясуць службу сапраўдныя прафесіяналы.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Главное –** сердцем не стареть : к 25-летию Белорусской общественной организации ветеранов органов внутренних дел и внутренних войск. – Минск : “Минкопринт”, 2016. – 220 с : ил.

См. на с. 21,31,32,35,116,158-163,193-194.

**Кобринский РОВД** // Храним традиции Брестской милиции: 1939-2014 : к 75-летию милиции Брестчины. – Брест, 2014. – С. 92-94.

**Служба** уголовного розыска. 95 лет : [1939-2014] / [С. Б. Чирко, Ю. В. Перетолчин]. - Кобрин : [Б. и.]. - [92 с.].

**Съедин, С.** Кобринские традиции / Сергей Съедин // У хорошего поководца нет плохих солдат : очерки о белорусской милиции. – Минск, 2002. – С. 3-11.

**Тимошенко, И. О**. Солдаты милиции / И. О. Тимошенко. – Минск : Беларусь, 1976. – 144 с.

**Чубаров, Б. Н.** Будни милиции : сборник рассказов / Б. Н. Чубаров. - Брест : Альтернатива, 2020. – 175 с. : фот.

**Чубаров, Б. Н.** На службе людям : в ознаменование 75-летия образования Кобринского РОВД : [биографические очерки о сотрудниках Кобринской милиции, рассказы] / Б. Н. Чубаров. - Брест : Альтернатива, 2014. - 163 с. : ил., портр.

**Аддзелу** ўнутраных спраў Кобрынскага райвыканкама (1939) – 85 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 137-138.

**Белов, Д**. Семейное призвание — хранить покой страны / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2024. — 2 сакавіка (№ 9). — С. 13 : фот.

О милицейской семье Игоря и Ирины Карпович.

**Белов, Д.** Сергей Петряев: "Готовность отдела на должном уровне" / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2024. — 2 сакавіка (№ 9). — С. 13 : фот.

О том, как несут службу правоохранители Кобринщины, по материалам беседы с начальником отдела внутренних дел Кобринского райисполкома Сергеем Петряевым.

**В Кобринском** РОВД — новый начальник / соб. инф. // Кобрынскі веснік. - 2024. — 10 лютага (№ 6). — С. 8 : фот.

1 февраля 2024 г. С. М. Петряев назначен на должность начальника отдела внутренних дел Кобринского райисполкома.

**Елизарова, Ж.** Вадим Корженевич: «Порядок в ходе уборочной страды будет обеспечить / беседовала Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. 2024. - 3 жніўня (№ 31). – С. 18 : фот.

О том, какое участие в уборочной страде принимают органы внутренних дел, рассказал заместитель начальника Кобринского РОВД – начальник милиции общественной безопасности Вадим Корженевич

**Белов, Д.** "Бывших" — не бывает: в Кобринским РОВД чествовали ветеранов службы / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 18 лістапада (№ 68). — С. 17 : фот.

**Белов, Д.** "Оперативный дежурный слушает" / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 4 сакавіка (№ 17). — С. 1, 10 : фот.

О работе оперативно-дежурной службы Кобринского РОВД по рассказу начальника службы майора милиции Игоря Карповича.

**Белов, Д.** Роман Утрата: "Главная задача — помогать людям" / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 18 лістапада (№ 68). — С. 17 : фот.

Старший лейтенант милиции Кобринского РОВД Роман Утрата рассказал о буднях участковых инспекторов.

**Мельник, Р. В.** Главная задача – сохранить порядок и спокойствие / Роман Мельник // Кобрынскі веснік. - 2023. - 14 студзеня (№ 3). – С. 3 : фот.

В Кобринском РОВД прошло итоговое оперативное совещание.

**Елизарова, Ж**. МЧС — это надежда каждого / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2022. — 31 жніўня (№ 66). — С. 4 : фот.

**Савчук, М.** Человек-легенда / страницу подготовила Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 12 ноября (№ 46). — С. 6 : фот.

О талантливом руководителе Кобринщины, полковнике милиции в отставке Н. И. Корниевиче.

**Белов, Д.** На страже законности и правопорядка / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 лістапада. — С. 1, 3 : фот.

Кобринскому РОВД — 80 лет.

**Белов, Д.** На страже интересов кобринчан / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 сакавіка. — С. 1, 2.

О работе Кобринского РОВД.

**Бялоў, Д.** Служыць закону, народу, Айчыне! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2019. — 6 лістапада. — С. 3 : фот.

Аддзел унутраных спраў Кобрынскага райвыканкама адзначыў 80-гадовы юбілей.

**Савчук, М.** 80 лет на страже правопорядка / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2019. – 6 ноября. – С. 6.

Кобринский районный отдел внутренних дел отметил 80-летие со дня образования.

**Степанюк, В. М**. Кобринский РОВД снова лучший! / [Владимир Степанюк ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2018. — 1 марта. — С. 4.

О результатах работы Кобринского РОВД беседа с начальником райотдела В. М. Степанюком.

**Степанюк, В**. На страже спокойствия и порядка / [Владимир Степанюк ; беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2017. — 4 сакавіка. — С. 3.

**Степанюк, В**. Путь длиною в сотню лет / Владимир Степанюк // Кобрин-информ. - 2017. - 2 марта. - С. 4.

История образования Кобринского районного отдела внутренних дел.

**Участковые** инспекторы милиции РОВД // Кобрынскі веснік. - 2017. — 25 студзеня. — С. 5.

**Белов, Д.** Лучшая дежурная служба — в Кобринском РОВД! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2016. — 9 ліпеня (№ 55). — С. 1, 3 : фот.

**Дубина, Л.** Милиционер по призванию, художник в душе / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. — 13 лютага. — С. 3.

Старший лейтенант милиции Андрей Шугай стал лучшим участковым инспектором милиции Брестчины.

**Степанюк, В**. "В этом городе ответственность для преступников не минуема" / Владимир Степанюк ; [беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2016. — 2 сакавіка. — С. 3.

**Китель, В. М**. Кобринским правоохранителям вручили почетный приз Асташенка / В. М. Китель // Кобрин-информ. – 2015. – 5 февраля. – С. 7.

Кобринский РОВД – лучший среди райотделов области по эффективности оперативно-служебной деятельности по итогам 2014 года.

**Степанюк, В**. "Милиционер - это образ жизни" / Владимир Степанюк ; [беседовал] Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2015. — 12 жніўня. — С. 1,3.

Интервью с начальником Кобринского РОВД Владимиром Степанюком.

**Белов, Д**. На переднем крае : будни уголовного розыска / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2014. — 25 кастрычніка. — С. 10.

Работа уголовного розыска Кобринского РОВД.

**Бялоў, Дз**. І заўсёды па законе / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара і з архіва Р. Алесюка // Кобрынскі веснік. - 2014. — 1 лістапада. — С. 3.

**Суббота, М. А.** Кобринскому РОВД – 75 лет. Из истории становления Кобринского РОВД / М. А. Суббота // Кобрин-информ. – 2014. – 30 октября. – С. 4-5.

**Список** участковых инспекторов милиции РОВД // Кобрынскі веснік. - 2013. — 23 лютага. — С. 9.

**Субота, М**. "Забяспечыць законнасць - задача кожнага дня" / Максім Субота // Кобрынскі веснік. - 2012. - 3 сакавіка. - С. 1, 4.

**Суббота, М**. Почётный приз у Кобринского РОВД / [Максим Суббота, беседовал] Игорь Федарович // Кобрынскі веснік. - 2012. - 8 лютага. - С. 3 ; Народная трыбуна. - 2012. - 17 лютага. - С. 3.

**Сотрудники** Кобринского РОВД проводят месячник по трудоустройству // Кобрин-информ. - 2011. - 16 июня. - С. 2.

**Уладзіміраў, Д**. Лепшы ўчастковы вобласці працуе ў Кобрынскім РАУС / Дзмітрый Уладзіміраў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 4 снежня. - С. 1 ; 8 снежня. - С. 4.

**У РОВД** новый адрес // Вечерний Брест. - 2009. - 30 октября. - С. 1 ; Заря. - 2009. - 31 октября. - С. 2.

**Ярошук, Э. А**. "Мы достигли 100% результата в раскрытиии тяжких преступлений" / Э. А. Ярошук, [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2009. - 22 января. - С. 4.

**Ярошук, Э. А**. Со стороны сотрудников РОВД нарушений законности не установлено / Эдуард Ярошук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 5 красавіка. - С. 2.

**Александров, А**. Здание РОВД будет передано епархии / А. Александров // Кобрынскі веснік. - 2007. - 17 студзеня. – С. 4.

**Савчук, М.** Капсулу с посланием заложил министр МВД / М. Савчук // Кобрин-информ. - 2007. - 18 января. - С. 1,2.

Министр внутренних дел Республики Беларусь Наумов заложил капсулу в фундамент строящегося здания Кобринского РОВД.

**Савчук, М.** Знакомьтесь: новый начальник РОВД : [Шаринда А. З.] / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2004. – 21 октября. – С. 3.

**Кобринский** РОВД // Кобрин-информ. – 2003. – 27 февраля.

**Савчук, М.** Жизнь – в службе : [о полковнике Н. И. Корниевиче – бывшем начальнике Кобринского РОВД] / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2003. – 6 марта. – С. 4.

**Николаев, В.** Добрые дела всегда ко времени / В. Николаев // Заря. – 2002. – 12 февраля. - С. 2.

О Совете ветеранов Кобринского РОВД.

**С′едзін, С.** Наш пачэсны абавязак – служыць народу / С. С′едзін // Кобрынскі веснік. – 2001. – 3 сакавіка. – С. 1, 2 : фат.

**Кобринский** горрайотдел милиции // Заря. – 1991. – 6 ноября.

**Гартаючы** старонкі гісторыі : [Кобрынская міліцыя] // Камуністычная праца. – 1983. – 10 лістапада.

**Ісмакаў, М.** Першыя дні Кобрынскай міліцыі / М. Ісмакаў // Камуністычная праца. – 1967. – 11 лістапада.

**Кобрынскі раён**
**Кобрын**
**Кобрынскі РАУС**
**Міліцыя**